шения автокефалии, политическим значением городов с кафедрами первых епископов. Автокефальная Церковь сама канонизирует своих святых, сама составляет новые чинопоследования и песнопения. Автокефальный статус может Церковью как приобретаться, так и утрачиваться.

***А.А. Міхневіч***
БДУ (Мінск)

# СУДОВЫ ПРАЦЭС ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЯК АДНА З АСНОЎ КАНСТЫТУЦЫЯНАЛІЗМУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Разглядаючы матэрыяльныя нормы права, нельга не закрануць працэсуальныя нормы, якія маюць не меншую значнасць у агульным развіцці нацыянальнага права, бо менавіта яны ажыццяўляюць прадпісанні матэрыяльных норм, з'яўляюцца іх увасабленнем у рэальным жыцці. Увогуле гісторыя судовага працэсу патрабуе значнай увагі даследчыкаў.

Для лепшага разумення гэтай праблемы перш за ўсё трэба звярнуць увагу на органы, якія ажыццяўлялі працэсуальную дзейнасць. У XVI ст. у Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ), існавала разгалінаваная сістэма судоў, а таксама існавалі судовыя выканаўцы (возныя), адвакаты, якія так ці інакш выконвалі працэсуальную функцыю. Увогуле ролю непасрэднага «маста», які злучаў працэсуальныя і матэрыяльныя нормы, адыгрывалі суды ВКЛ. Стварэнне ў працэсе судовай рэформы XVI ст. выбарных, самастойных і цалкам аддзеленых ад адміністрацыі судоў паказвала прагрэсіўнасць новых прававых норм, уведзеных у ВКЛ, высокую прававую культуру тагачаснага грамадства. Хоць гэтыя суды выражалі ў асноўным інтарэсы прывілеяванага саслоўя, аднак яны паказалі сапраўдны прарыў у развіцці права ВКЛ, у тым ліку і адносна працэсу.

Дзейнасць гэтых судоў была дакладна ўрэгулявана Статутамі ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг., прычым з кожным новым статутам іх паўнамоцтвы ўдасканальваліся. Суды паступова ператвараліся з органаў, якія адлюстроўваюць дзяржаўныя інтарэсы, у органы, якія абаранялі інтарэсы грамадзян (у тым ліку і непрывілеяваных саслоўяў). Так, простыя людзі маглі падаваць скаргі на ваяводаў, старастаў і іншых службоўцаў у земскія, гродскія суды. У законе прадугледжвалася падача апеляцый у Галоўны суд ВКЛ. Хоць у рэчаіснасці дэмакратычная функцыя судоў заставалася неажыццяўлённай, суды набіралі ўсё большую моц, самастойнасць і аўтарытэт. Па Статуту 1588 г. яны нават пачалі ажыццяўляць кантрольную функцыю над мясцовай адміністрацыяй.

Асноўнай праблемай у рэфармаванні працэсу ў той час была моцная сувязь працэсуальных норм са звычаем, фактычна працэсуальныя ад-

носіны яшчэ доўгі час рэгуляваліся нормамі звычаёвага права. Нават пасля выдання Статута 1588 г., у якім была значная колькасць працэсуальных норм, суддзі шмат у чым кіраваліся звычаем.

Адзначаючы прагрэсіўнасць працэсуальнага права ВКЛ, важна акцэнтаваць увагу на тым, што Статут ВКЛ 1566 г. адным з першых увёў інстытут прэзумпцыі невінаватасці, а Статут 1588 г. пашырыў яе і на простых людзей. Заканадаўца таксама прадпісвае судам (суддзям) у шматлікіх артыкулах Статута 1588 г. неабходнасць схіляцца да вызвалення ад пакарання ў выпадку сумнення.

Уводзіцца паняцце працэсуальнай правасдольнасці, якое паказвае здольнасць абараняцца ў судзе самастойна ці з дапамогай прадстаўніkоў. Бакі маглі самастойна або з дапамогай адваката весці справу, прадстаўляць розныя доказы, запрашаць сведкаў, падаваць скаргі на рашэнні суда і г.д. За падробку доказаў і непавагу да суда бакі караліся ў крымінальным парадку (падробка пісьмовых доказаў каралася смерцю). Аднак у феадальны перыяд суб'екты працэсу мелі не аднолькавую працэссуальную правасдольнасць. Як і раней яе аб'ём залежыў ад сацыяльнага і службовага становішча. Поўнай працэсуальнай правасуб'ектнасцю валодалі толькі буйныя феадалы.

У гэты ж час у ВКЛ узнікла судовая экспертыза. Яна вельмі дапамагала ў вырашэнні шэрагу спраў, бо з дапамогай экспертызы набываліся ўсё новыя і новыя доказы па справе. Экспертызу ажыццяўлялі спецыялісты ў той ці іншай сферы навукі і тэхнікі (медыцына, графалогія і г.д.). У выключных выпадках экспертызу ажыццяўлялі самі суддзі.

Заканадаўца ВКЛ заўсёды адрозніваўся прагрэсіўнасцю свайго падходу да прававых праблем, аднак нават яму было цяжка адмяніць нераўнапраўе ў судовым працэсе.

***К.Р. Павловский***

БГЭУ (Минск)

# КОНСТИТУЦИОННО-ПРАВОВОЙ СТАТУС ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Встав на путь демократических перемен, Республика Беларусь вынуждена была обратиться к мировому опыту демократического развития, к ценностям, оказывающимся базовыми для построения отношений ведущих государств Европы, да и всего мира в целом. Наиболее общим и, следовательно, конкретным понятием, воплощающим в себе смысл всех этих базовых ценностей, является собственно понятие «демократия», по отношению к которому все остальные понятия, обозначающие другие ценности, оказываются уточняющими. Одним институтом, через который осуществляется демократия, является институт президентства, возникший в рамках европейской политической куль-



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by